# Голас Радзімы

№ 36 (2126)
7 верасня 1989 г.

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ (БЕЛАРУСКАЕ ТАВАРЫСТВА «РАДЗІМА»)

Выдаецца з 1955 г.
Цана 4 кап.




**УПЕРШЫНЮ Ў МІНСКУ ТУРЫСТЫЧНАЯ ГРУПА ВУЧНЯЎ БЕЛАРУСКІХ ШКОЛ З БЕЛАСТОЧЧЫНЫ**


(«Адчувалі сябе дома»)
Стар. 4


**СЦЭНІЧНАЕ МАСТАЦТВА НА НОВЫМ ВІТКУ НАЦЫЯНАЛЬНАГА КУЛЬТУРНАГА АДРАДЖЭННЯ**


(«Крок зроблены. Што далей!»)
Стар. 6


**Прафесія марака заўсёды была акружана арэолам рамантыкі. Плысці ў нязведаныя далі, змагацца з бурамі, моцна сябраваць і верна кахаць—што можа быць больш прывабным для мужчыны. Гомельскае спецыяльнае прафесійна-тэхнічнае вучылішча вядомае ў нашай «сухапутнай» рэспубліцы тым, што тут рыхтуюць спецыялістаў для марскога і рачнога флоту. Юнакі, якія заканчваюць яго, працуюць на караблях, у портах, а некаторыя ў далейшым нават капітанамі далёкага плавання, начальнікамі рачных і марскіх портаў. Вучылішча было створана пяцьдзесят гадоў назад. З таго часу з яго сцен выйшлі каля 10 тысяч выпускнікоў.**

**НА ЗДЫМКУ: дваццаць адзін год працуе ў вучылішчы майстар вытворчага навучання Марат АРДАШНІКАЎ.**

**Фота М. АМЕЛЬЧАНКІ.**







*Inclusive a vuelo de pájaro el koljos-combinado "Zorka" de la región de Vítebsk se asemeja hoy a un enorme solar en construcción. Se erigen casas de vivienda, edificios de producción y se construyen caminos. En el koljos-combinado hay cuatro jardines de la infancia y se empezó a construir una guardería casa-cuna para 150 plazas con dos piscinas de natación. Ya se perfilan los contornos de un nuevo poblado moderno para 450 casas de tipo hacienda. En las fotos: nació una nueva familia. El operador Serguei LESCHINA con su esposa Alla registran su casamiento en el Soviet Rural; cuando la mamá y el papá de N. ZHOLUDEVA trabajan, ella está rodeada con el cuidado del personal del jardín de la infancia "Zorachka"; el grano de la nueva cosecha.*

# LOS MISTERIOS DEL BOSQUE

**Luego de la publicación en el número 21 de "NM" de un resumen de la prensa polaca y fuentes occidentales "Katín: comprobar o refutar" acerca de la matanza de varios miles de oficiales polacos cerca de Smolensk a principios de los años cuarenta. El bosque de Katín no es sólo el lugar donde se cometió el crimen contra los oficiales polacos y lugar de sepultura de 135 mil de nuestros prisionaros de guerra fusilados durante la ocupación hitleriana, sino que, a partir de 1935, se convirtió en un enorme sepulcro, aún no descubierto por nadie, de miles y miles de víctimas de la represión estalinista.**

Parecía que no era difícil revelar la verdad Los órganos punitivos de aquellos años, desde luego, no hacían gala de sus actividades, pero tampoco las ocultaban mucho. El miedo universal fue su aliado, ayudaba a trabajar, convirtiendo a la gente en gentuza y, a algunos, en delatores voluntarios.

Pero sobre la tierra pasó una guerra terrible, devastadora y aún antes, una guerra contra su propio pueblo. Luego hubo quien "emigró" a las tierras vírgenes, a las gigantescas obras de construcción y luego sobrevino el olvido. Quedaron muy pocos testigos oculares, que viven aquí a partir de los años 30. Además, la mayoría de ellos se niegan a recordar, mirando temerosamente hacia la zona del silencio, al bosque de Katín, que sigue estando rodeado por una cerca y alambre de púas.

**Testimonio de Leonid Kótov, profesor de la cátedra de Ciencias Sociales del Instituto de Cultura Física de Smolensk:**

"En los años 60, trabajando sobre el libro de los combatientes clandestinos durante la invasión alemana, por primera vez oí hablar sobre los asesinatos masivos en el bosque de Katín, ocurridos antes de la guerra. A partir de los años 30, prácticamente de Minsk a Moscú, a lo largo de la carretera, estaban ubicados los campos de concentración del NKVD. La autopista estratégica requería una modernización radical. Decenas de miles de presos desprovistos de maquinaria auxiliar alguna, con palas y carretillas trabajaban desde la madrugada hasta la noche. Aquellos que habían cometido alguna falta y los debilitados físicamente eran conducidos al bosque de Katín. Al principio decían que allí se encontraba un sanatorio para los funcionarios del NKVD. Pero, los camiones que iban y venían no se ajustaban a la idea de una zona secreta de descanso. Y, ¿quién se habría atrevido en aquel entonces satisfacer su curiosidad?".

Contemplando el bosque de Katín hoy, he pensado que éste, hasta la fecha, no es nada hospitalario. No son muchos los que incluso hoy se atreven a visitarlo. No obstante, hasta en aquel entonces, cuando se prohibía todo, hubo gente valiente. ¡Eran los niños! Descalzos, siempre semihambrientos, venciendo el miedo con plena conciencia del castigo a que se exponían, iban e iban allí al igual que los "stalkers" de la novela "Picnic en el arcén", de los hermanos Strugatski.

**Testimonio de Zinaida Merkúlenko, ex vecina del distrito Kozi Gori:**

"Yo misma iba a la zona a recoger hongos y bayas, pero sólo después de la guerra. Allí crecían fresas tan buenas como nunca más he encontrado en mi vida. Eran grandes y dulces. Pero tenía miedo de internarme en la profundidad del bosque. No tanto temía a los centinelas, cuanto a los perros mastines. Eran enormes y muy malos. Eran capaces destallar viva a la gente. Así que sólo íbamos por el costado del bosque...

Pero los chicos mayores, aún antes de la guerra, se metían en lo más profundo del bosque, pero nunca nos llevaban consigo. Cierta vez les oí decir que al bosque llegaban camiones repletos de gente, a la cual luego fusilaban. Cuando los camiones se retiraban, los niños removían la tierra de la fosa, y no faltaban quienes quitaban a los cadáveres las botas altas de cuero e, incluso, la ropa.

Así era la vida. Vivíamos en la miseria. Hubo casos en que traían hasta botas de becerro, las cuales solían usar sólo los oficiales de rango superior.

A veces, cuando los chicos se acercaban a la fosa, ésta parecía respirar: eso significaba que no habían logrado asesinar a todos. Tenían prisa para ir a coger a otros... La fosa era profunda, enterraban a unos y se marchaban para traer a otros. Disparaban hombres en máscaras parecidas a yelmos.

No sé con qué frequencia llegaban los camiones, nadie los contaba. Pero hablaban de esto mucho y nos asustaban con este bosque. Ahora es difícil encontrar a testigos. Unos murieron, otros se marcharon. Intente interrogar a la gente en Kozi Gori, tal vez encontrará a alguien, aunque es poco probable..."

**Alexandr Kosinski, participante en la guerra contra Finlandia y en la Gran Guerra Patria, poblado Solievka:**

"En este lugar se encontraba el campo de concentración de Viazma. De él conducían a los presos a los alrededores de Krásnoye y, según decía la gente, los fusilaban. En aquel entonces yo trabajaba en una empresa de acopio de granos, ubicada cerca de la estación ferroviaria de Katín. A la estación llegaban vagones llenos de gente, a los cuales se acercaban los camiones para transportarlos al bosque.

Yo, personalmente, nunca oí disparos. Diríjase usted a Gnezdovo, sus habitantes vivían más cerca del bosque que nosotros, quizá sepan más".

**Mijaíl Krivozértsev, poblado Gnezdovo:**

"Oí hablar mucho de los fusilamientos en el bosque de Katín, aún en los años prebélicos. Especialmente, sobre las sepulturas en el Bosque Rojo. Allí estaba dislocada una unidad especial, parece que justamente para eso...

Personalmente vi y sé lo siguiente. En 1943, Iván Andréev y Fiódor Kúftikov informaron a los alemanes que ellos conocían el lugar donde los nuestros habían fusilado a los polacos. Sobre todo se esforzaba Kúftikov. Durante la Primera Guerra Mundial había caído prisionero y, como tal, algún tiempo permaneció en Alemania, aprendiendo un poco el alemán. Quizás, deseaba ser alcalde del poblado o tenía otra razón, pero lo cierto es que se esforzaba mucho. Los alemanes reunieron a unos cuantos pobretones como yo y nos llevaron al bosque. Allí nos dieron a cada uno un vaso de vodka y nos ordenaron excavar las fosas.

Les dieron a todos, menos a mí. Entonces le digo a un intérprete alemán: ¿Por qué no me has dado vodka? Este me contesta: "Tus hermanos combaten contra nosotros". "Vete al diablo, pues entonces no pienso cavar, no estoy para eso", le dije.

Y me quedé de brazos cruzados. Primero, sacaron de la fosa 18 cadáveres de nuestros evangelistas. Estos llevaban las botas de fieltro colgadas a la espalda. En las botas habían escondido tocino y pan tostado. ¿Por qué digo que eran evangelistas? Mi padre era evangelista. Cuando llegaron para detenerlo, él cogió las botas de fieltro, metió dentro tocino y pan, pensando que lo llevarían al Norte. También aquella gente había pensado lo mismo, pero cayeron aquí...

Luego sacaron a 300 polacos. Pero, fíjese, que los nuestros estaban encima de los polacos. Los alemanes ordenaron enterrarlos en una tumba aparte. Empezaron a realizar una nueva excavación. En la profundidad otra vez encontraron ropa y zapatos de mujer.

Después los alemanes instalaron allí un depósito de calderas. Lavaban los cráneos con agua caliente, verificando dónde y cuáles fueron las heridas. Analizaban. En total, examinaron 3000 cadáveres".

**Iván Kiseliov, poblado Gnezdovo:**

"A partir de 1935, desde Smolensk se dirigían al bosque de Katín camiones con gente fusilada. Dónde la fusilaban, no lo sé. Pero en aquella época aún no había alambre de púas. Quien iba a recoger bayas, veía los sepulcros preparados y ya cerrados. De ello, en aquel entonces no hacían ningún secreto. Sólo más tarde apareció la cerca, pero con ésta tampoco era posible ocultarlo todo. Empezaron a cubrir las tumbas con césped y a plantar árboles. Dígame, ¿para qué plantar pinos en un bosque?"

* * *

La gente recordaba de distinta manera. Algunos, voluntariamente, otros con temor. A veces, el tiempo se desplazaba en su mente: ora se comprimía, ora se extendía. Algunos hechos eran muy precisos, otros se contradecían entre sí. Hubo algo que se parecía mucho a una leyenda. Por ejemplo, la anécdota de cómo tn víspera de la guerra, por la madrugada, en la sede del NKVD irrumpió un tal **Petrov** afirmando que no tenía ninguna culpa y que lo habían fusilado por error. Resultó que su nombre, en realidad, figuraba entre los condenados a la pena capital, pero no fue muerto, sino que estuvo sin sentido por largo rato. Al volver en sí, logró quitarse la tierra de encima y marchó a la ciudad. Los funcionarios del NKVD, quienes quedaron desconcertados por el carácter absurdo de la situación, le expidieron documentos a nombre de **Ivanov** y lo mandaron fuera de la región.

¿Tuvo lugar este caso? Y, ¿por qué no? Ya que ninguno de los habitantes más antiguos no dudaba de los fusilamientos masivos en Katín. Habrá quien diga ¡qué importan los recuerdos! Si no hay documentos, entonces no hubo nada. Aún hace poco tal argumento era para nosotros el veto más riguroso. ¿Cómo distinguir una leyenda de la verdad y la verdad, incluso la más horrible, hacerla patrimonio de nuestra historia? No hemos conseguido encontrar documentos, inclusc con la colaboración de Anatoli Sheverskij, jefe del comité regional de seguridad del Estado. Tan sólo carpetas muy finas (de tres o cuarto folios) de los expedientes personales de los condenados. Cada uno de ellos tiene la inscripción: "Conservar eternamente". Estos contienen breves descripciones de destinos de sencillos obreros, campesinos y sacerdotes: "alianza monárquica de eclesiásticos". Todos ellos han sido rehabilitados o están en proceso de su rehabilitación. Sheverskij no logró hallar siquiera rastros de la misteriosa unidad militar que estaba acantonada en el bosque, así como actas de defunción. Tal vez se borraran las huellas, pero podía ser que debido a la antigüedad dichos documentos se hubieran destruido, puesto que no llevaban la inscripción "conservar eternamente".

Sin embargo, no todos los documentos desaparecieron sin dejar rastro. He aquí uno de ellos, encontrado durante el período de "deshielo", cuando los ex jueces de instrucción y ejecutores fueron llamados a la responsabilidad y de los archivos se sacaban antiguos pleitos.

En 1939, por la organización de represiones masivas (es decir, por haber pertenecido al aparato del ex comisario del pueblo de Asuntos Interiores, Nikolái Ezhov) fue fusilado Nasedkin, comisario del pueblo de Asuntos Interiores de Bielorrusia, quien en 1937 trabajó de jefe de la Dirección del NKVD para la región de Smolensk. En uno de los interrogatorios Nasedkin testimonió: "...en 1937, en la región de Smolensk, por primera categoría (o sea, el fusilamiento) fueron condenadas 4.500 personas".

¡Y eso sólo en 1937! Mientras que los camiones iban al bosque de Katín a partir de 1935, y no sólo de la región de Smolensk. No cambiaron su itinerario incluso en 1938 y hasta 1941. No enterraban a todos en los cementerios de las cárceles. Ninguno de ellos habría aguantado tales sepulcros masivos.

Tenemos un documento más: los propios sepulcros. Hay personas que mucho antes que nosotros comprendieron su valor. Sólo el año pasado tres individuos en Smolensk fueron condenadas por saqueo y profanación de tumbas. ¿Cuántos han logrado evitar el castigo? El bosque de Katín debe dejar de ser un guardián de misterios, y convertirse en un cementerio. Porque allí yacen juntos tanto rusos, como judíos, polacos y letones en capas de una misma época. Sin flores ni monumentos yacen las víctimas de un crimen sin precedentes.

**Guenadi ZHAVORONKOV**

**Redactor de la "Página en español": Demetrio OKULIK**

**ДА ГАРМАНІЗАЦЫІ АГУЛЬНАЧАЛАВЕЧАГА СУПОЛЬНІЦТВА НАРОДАЎ, НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ І ДЗЯРЖАЎ**

# ВЯРТАННЕ ДОЎГУ: БЕЛАРУСІЗАЦЫЯ

**[Заканчэнне. Пачатак у №№ 34, 35].**

У яе агульнай частцы адзначалася: «1. Мовы ўсіх нацыянальнасцяў, якія жывуць на тэрыторыі Беларусі (беларуская, яўрэйская, расійская, польская) з'яўляюцца раўнапраўнымі. 2. З прычыны значнай перавагі ў БССР насельніцтва беларускай нацыянальнасці беларуская мова выбіраецца як мова пераважная для зносін паміж дзяржаўнымі, прафесіянальнымі і грамадскімі ўстановамі і арганізацыямі... 5. Мовай зносінаў органаў БССР з органамі СССР і іншых саюзных рэспублік з'яўляецца мова расійская». Ставілася задача — стварыць пры ВНУ кафедры па вывучэнню мовы, літаратуры, гісторыі, геаграфіі, эканомікі Беларусі, садзейнічаць развіццю беларускага тэатральнага мастацтва і нацыянальнага кінематографа. Палажэнне пра дзяржаўнасць беларускай мовы ў межах Беларусі пазней увайшло ў Канстытуцыю БССР 1927 года.

Да канца 20-х гадоў ЦК КП(б)Б, ЦВК Беларусі трымалі пад кантролем выкананне ўрадавай праграмы беларусізацыі. У 1928 годзе Нацыянальная камісія ЦВК БССР апублікавала грунтоўную справаздачу пра поспехі і цяжкасці яе рэалізацыі. Паводле перапісу насельніцтва 1926 года, у БССР пражывала 4 017 301 беларус, або 80,62 працэнта ўсіх жыхароў рэспублікі, пры гэтым сярод сельскага насельніцтва яны складалі 89,1 працэнта, а сярод гараджан — толькі 39,26 працэнта. Рускіх было тады ў БССР 383 806 чалавек (7,7 працэнта ўсяго насельніцтва рэспублікі), а яўрэяў — 407 059 чалавек, або 8,1 працэнта. Быў праведзены аналіз нацыянальнага складу служачых цэнтральнага і мясцовага апарату БССР на 1925 год. Сярод іх беларусы складалі 59,8 працэнта, рускія—13,1 працэнта, яўрэі—19,1 працэнта, палякі — 3,4 працэнта, прадстаўнікі іншых народнасцей — 4,6 працэнта. Значная частка беларусаў-служачых была дэнацыяналізавана і не карысталася беларускай мовай. Павалі адбываўся працэс станаўлення беларускага рабочага класа. Пра гэта сведчыў нацыянальны склад прафсаюзаў, дзе беларусаў на 1927 год было 45,59 працэнта, рускіх — 5,5 працэнта, яўрэяў — 42,6 працэнта, палякаў — 4,1 працэнта. Недастатковая сацыяльная мабільнасць беларусаў, пераважна сялян, а таксама незавершанасць працэсу станаўлення нацыянальнай самасвядомасці сярод пэўнай часткі іх былі аб'ектыўнай прычынай тых цяжкасцей, якія ўзніклі пры ажыццяўленні праграмы беларусізацыі. Але былі тут і суб'ектыўныя прычыны — актыўнае і пасіўнае супраціўленне беларусізацыі служачых ды іншых слаёў русіфікаванага насельніцтва. У такіх умовах праводзенне беларусізацыі было справай нялёгкай. Пра гэта сведчаць адпаведныя партыйныя і дзяржаўныя пастановы. У рэзалюцыі кастрычніцкага 1925 года Пленума ЦК КП(б)Б «Аб нацпалітыцы» адзначалася, што беларусізацыя сістэмы дзяржаўнага і сацыяльна-эканамічнага кіравання з'яўляецца «найбольш слабым месцам». Пленум звярнуў увагу партыйных арганізацый на тое, каб яны «падавалі прыклад апарату ў справе беларусізацыі». Праз год чарговы Пленум ЦК КП(б)Б (кастрычнік 1926 года) зноў вярнуўся да абмеркавання гэтай праблемы. Была нададзена пільная ўвага неабходнасці пераходу партыйнага друку на беларускую мову, поўнай беларусізацыі Беларускай вайсковай дывізіі. Ставілася задача ліквідаваць «беларускую непісьменнасць сярод беларусаў-рабочых; наладзіць вывучэнне беларускай мовы «рабочымі іншых нацыянальнасцей».

У ліпені 1925 года Прэзідыум ЦВК БССР прыняў пастанову пра незадавальняючае выкананне праграмы беларусізацыі ў выніку «незычлівых адносін часткі супрацоўнікаў устаноў да беларускай мовы» і рэштках «вялікадзяржаўных настрояў». Нацыянальнай камісіі ЦВК было даручана «зрабіць праверку ведаў беларускай мовы супрацоўнікамі ўстаноў і арганізацый», у тым ліку сярод апарату ЦВК, СНК і Наркамасветы БССР і «пры адмоўных адносінах да беларусізацыі» звольніць іх з працы. 16 верасня 1926 года ЦВК і СНК БССР прынялі пастанову «Аб парадку праверкі выканання рашэнняў 2-й сесіі ЦВК БССР 6-га склікання ад 15 ліпеня 1924 г. у частцы правядзення беларусізацыі апаратаў савецкіх і кааператыўных арганізацый і ўстаноў БССР». Ад такой праверкі вызваляліся толькі рабочыя і іншыя асобы фізічнай працы.

У выніку шматграннай арганізатарскай і творчай працы праграма беларусізацыі выконвалася, хоць з частковым парушэннем запланаваных тэрмінаў. У дырэктыўных дакументах ЦК КП(б)Б і справаздачах Нацыянальнай камісіі ЦВК БССР адзначаліся паспяховая праца пачатковай і сярэдняй школы з беларускай мовай навучання і выхавання, пачатак беларусізацыі ВНУ, тэхнікумаў і іншых форм прафесійнай адукацыі, значнае папаўненне беларускага кніжнага фонду, павелічэнне прадстаўнікоў беларусаў у выбарных органах усіх звенняў, беларусізацыя Беларускай вайсковай дывізіі, урэшце, наяўнасць кадраў настаўнікаў і перадавікоў-сялян, якія садзейнічалі беларусізацыі.

Створанае ў 1925 годзе Белдзяржкіно выпусціла на экраны першыя беларускія (на беларускай мове) мастацкія кінафільмы «Лясная быль», «Кастусь Каліноўскі», іншыя творы. Набыў вядомасць заснаваны ў 1921 годзе Беларускі дзяржаўны музей. У лістападзе 1920 года заснавана першае Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, шмат папрацавала на беларускую кнігу кааператыўнае выдавецтва «Адраджэнне», пазней перайменаванае ў выдавецтва «Савецкая Беларусь» (у верасні 1924 года аб'яднана з Дзяржвыдавецтвам). З 1926—1927 гадоў большасць цэнтральных газет (у тым ліку «Савецкая Беларусь» і «Звязда») і часопісаў, значная частка акруговых перыядычных выданняў былі беларускамоўнымі. Аб тым, што беларускі друк заняў вядучае становішча ў БССР, сведчыць статыстыка: у 1925—1926 гадах апублікавана 107 назваў беларускіх кніг агульным тыражом 1 123 000. У тыя ж гады ў рэспубліцы выйшла ў свет рускіх кніг 7 назваў агульным тыражом 27 тысяч, польскіх — 10 назваў (48 тысяч экземпляраў).

Практычнае ажыццяўленне палітыкі беларусізацыі і цяжкасці на гэтым шляху адлюстраваў беларускі друк 20-х—пачатку 30-х гадоў, асабліва газета «Савецкая Беларусь». У рэшце рэшт беларускае адраджэнне той эпохі не закончылася. У выніку рэпрэсій супраць беларускіх пісьменніцкіх, навукова-асветных і мастацкіх арганізацый пад выглядам «барацьбы» супраць прыдуманых сталіністамі «беларускага буржуазнага нацыянал-дэмакратызму» і «кулацкай ідэалогіі» беларусізацыя набыла непаслядоўны, кампрамісны характар. У кастрычніку 1929 года Бюро ЦК КП(б)Б патрабавала звальняць з пасады кіраўнікоў, якія не выконвалі «дырэктывы партыі і ўрада аб беларусізацыі». Аднак праз год агульны тон афіцыйных выступленняў змяніўся: пачаліся гутаркі пра памылковасць прымусовай беларусізацыі кіруючага апарату. У друку з'явілася новая тэндэнцыя — імкненне дэзавуіраваць раней выпрацаваную канцэпцыю першачарговага значэння беларускай мовы ў праграме беларусізацыі. І ўсё ж дзяржаўны і адміністрацыйны апарат, сферы культуры, навукі і сацыяльнага абслугоўвання ў выніку беларусізацыі паступова, хоць і не без цяжкасцей, набліжаліся да народа і яго роднай мовы. Толькі жорсткія сталінскія рэпрэсіі супраць народа і яго інтэлігенцыі падарвалі гэтае адзінства, а ў галіне культуры па сутнасці былі актам прымусовай дэнацыяналізацыі беларусаў, палякаў, яўрэяў і іншых нацыянальнасцей.

Але вось парадокс: нават у трагічныя для народа і яго культуры 30-я гады сацыяльны статус беларускай мовы быў значна вышэйшым, чым сёння. Бо вёска, дзе тады пражывала большасць насельніцтва БССР, вясковая агульнаадукацыйная школа, культурна - асветныя ўстановы, раённыя і абласныя педвучылішчы і настаўніцкія інстытуты ў пэўнай ступені заставаліся беларускамоўнымі. Палітыка беларусізацыі, хоць непаслядоўна, нярэдка ў скажонай форме, усё ж закранула кіраўнічы апарат, пранікла ў глыбінку. А пасля верасня 1939 года да БССР далучылася Заходняя Беларусь: яе нацыянальна-культурная «неруш» нават у пасляваеннае дзесяцігоддзе пазітыўна ўплывала на адносную стабільнасць беларускамоўнага асяроддзя ў рэспубліцы.

Дарэчы, нават у сталінскай Канстытуцыі БССР 1937 года народу гарантавалася права на адукацыю «навучаннем у школе на роднай мове». Мінула сорак гадоў, і вось брэжнеўская Канстытуцыя БССР 1978 года нават фармальна забыла пра гэтае права, абмежаваўшыся абстрактнай «магчымасцю навучання на роднай мове». Як сведчыць моўнае «здранцвенне» цэлых нацый (а сёння беларусы блізкія да таго), прычынай гэтай трагічнай нацыянальнай анігіляцыі ў цяперашнім індустрыяльна-урбанізаваным грамадстве з'яўляецца дэнацыяналізацыя ўсіх яго сфер кіравання і сістэмы падрыхтоўкі кадраў. Ужо ў другой палове 30-х—40-х гадоў вышэйшая школа Беларусі стала фактарам дэнацыяналізацыі ў эканоміцы, сацыяльнай сферы і культуры. А ў 60-х—70-х гадах тут засталіся толькі невялікія беларускамоўныя «выспы» — малалюдныя аддзяленні беларускай мовы і літаратуры філалагічных факультэтаў. Да таго ж і там амаль усе курсы, апрача беларускай філалогіі, чытаюцца на рускай мове.

**Уладзімір КОНАН,**
**доктар філасофскіх навук.**

## III. СПАДЧЫНА







**У песнях, што дайшлі да нас, — споведзь гісторыі, ва ўзорах ручнікоў і посцілак, у арнаментах вырабаў ганчароў—душа народа. Раскопкі гавораць, што жылі на нашай зямлі ўмелыя ліцейшчыкі, кавалі, ювеліры і нават майстры дзіцячых цацак. Зрэшты, чаму жылі! Імі і сёння багата Беларусь. Іх працай, іх творчасцю пішуцца новыя старонкі гісторыі.**

**НА ЗДЫМКАХ: у навукова-даследчай мастацка-эксперыментальнай лабараторыі Міністэрства мясцовай прамысловасці БССР плённа працуюць мастацтвазнаўцы, мастакі, народныя майстры, якія вывучаюць і захоўваюць традыцыі беларускай народнай творчасці. Неаднаразова іх работы экспанаваліся на міжнародных і ўсесаюзных выстаўках і былі высока ацэнены спецыялістамі. Многа арыгінальных вырабаў створана і народным майстрам па пляценню з саломкі Галінай САПУН; у вёсцы Гудзевічы Мастоўскага раёна працуюць чатыры музеі—літаратурны, этнаграфічны, ткацтва і лекавых раслін. Ініцыятар іх стварэння настаўнік Аляксандр БЕЛАКОЗ і народная майстрыха ткачыха Соф'я УЛАНОВІЧ каля аднаго з экспанатаў этнаграфічнага музея—хаты беларускага селяніна XVIII стагоддзя; ікона «Багародзіца Казанская». XVII стагоддзе. Аправа—шыццё бісерам, жэмчугам, металічнымі ніцямі. Гэтая тэхніка характэрная для Веткаўскага раёна.**

**Фота У. ШУБЫ, У. МЯЖЭВІЧА.**





У Мінску ў Доме прыроды прайшла выстаўка-продаж «Гладыёлусы-89». На ёй было прадстаўлена 200 сартоў кветак самых розных адценняў з калекцый кветаводаў-аматараў Г. Андраюка, Т. Скарняковай і Н. Цыбоўскага.

НА ЗДЫМКАХ: на выстаўцы «Гладыёлусы-89».

Фота У. ВІТЧАНКІ.

## ВЫПІСВАЙЦЕ ГАЗЕТУ «ГОЛАС РАДЗІМЫ»

**Паважаныя чытачы! Калі ў далейшым вы жадаеце рэгулярна атрымліваць інфармацыю пра жыццё Савецкай Беларусі, важныя палітычныя і культурныя падзеі ў рэспубліцы, пра развіццё яе эканомікі, культуры, надышоў час аформіць падпіску на «Голас Радзімы» на 1990 год.**

**Суайчыннікі, хто жыве ў капіталістычных краінах і краінах, што сталі на шлях развіцця, могуць зрабіць гэта праз магазіны і фірмы, якія супрацоўнічаюць з «Міжнароднай кнігай» і Цэнтральным агенцтвам зарубежных выданняў.**

**У сацыялістычных краінах аформіць падпіску можна ў пунктах падпіскі ці ў паштовых аддзяленнях па месцу жыхарства.**

**У Савецкім Саюзе выпісаць «Голас Радзімы» можна ў любым аддзяленні «Саюздруку».**

**Наш падпісны індэкс у рэспубліканскім і ўсесаюзным каталогах падпіскі — 63854, цана на год (для Савецкага Саюза) — 2 рублі.**

### *АДКУЛЬ НАЗВА*

# НА ДЗЯМ'ЯНКАЎСКІМ НАВАКОЛЛІ

Яшчэ ў XIX стагоддзі на старонках перыядычных выданняў, спецыяльных часопісаў і зборнікаў, якія выдаваліся Геаграфічным таварыствам пры Расійскай акадэміі навук, часта друкаваліся дарожныя нататкі даследчыкаў, падарожнікаў, звычайных аматараў старадаўнасцей. Гэтыя людзі адпраўляліся ў самыя розныя мясціны, у тым ліку нярэдка і ў беларускае Палессе, у пошуках усялякіх старажытнасцей і ў надзеі запісаць невядомыя казкі і легенды, даследаваць асаблівасці мясцовай гаворкі, убачыць уласнымі вачыма прыроду краю. Непазнанае вабіла гэтых энтузіястаў. Не выпадкова іх этнаграфічныя і гістарычныя нарысы і замалёўкі змяшчаюць унікальныя і вельмі важныя для сучасных даследаванняў факты.

Даўнія апісанні, на жаль, аказваюцца нярэдка амаль ці не адзінымі сведчаннямі з мінулага многіх нашых населеных пунктаў. Але яны, на шчасце, служаць і своеасаблівым компасам для аднаўлення гісторыі краю.

...Я еxaў у **Дзям'янкі**, што за 22 кіламетры ад раённага цэнтра Гомельскай вобласці горада Добруша, з цікавымі выпіскамі з кнігі «Россия. Полное географическое описание нашего Отечества», якія вабілі сваёй незвычайнасцю і загадкавасцю. Вось што гаварылася ў згаданай кнізе: «Уверх па рацэ Іпуць, вярстах у 16 на паўночны ўсход ад Добруша, на правым беразе ракі, ляжыць вёска Дзям'янкі, у наваколлі якой існуе ўрочышча Селішча. Яно ўяўляе сабой пляцоўку ў некалькі квадратных вёрст з рэшткамі каменнага веку, якія знаходзяцца на беразе Іпуці. Тут жа размешчана мноства курганоў са слядамі звычайнага пахавання і трупаспалення. На поўнач ад гэтай вёскі, за 10 вёрст ад вёскі Закружжа, размешчана так званае Равучае возера, якое часам выпускае якісьці роў. Мабыць, ад возера маецца падземная сувязь з ракой Іпуць (так званыя карставыя з'явы). На дне возера ляжыць лес; згодна з паданнем, ужо ў гістарычную эпоху тут адбыўся правал мясцовасці».

Усё гэта было вельмі цікава. І калі я для большай верагоднасці загадзя зазірнуў у сучасныя археалагічныя апісанні, то пераканаўся, што дзям'янкаўскае наваколле сапраўды з'яўляецца гістарычным месцам. Цяжка было ўявіць, што спадчына шматлікіх стагоддзяў складалася тут з самых разнастайных бурлівых і маўклівых падзей.

Побач з Дзям'янкамі на беразе Іпуці адкрыты дзве стаянкі эпохі неаліту, на месцы якіх знойдзены крамянёвыя прылады працы і фрагменты ляпной керамікі. У другім месцы ў XII—XIII стагоддзях размяшчалася паселішча радзімічаў. Абпаленыя камяні, вугаль, гаршчок, бронзавы пярсцёнак, жалезнае крэсіва, нажы, рыбалоўны кручок, глінянае і каменнае грузілы і іншыя рэчы, якія захоўваюцца цяпер у Гомельскім краязнаўчым музеі, служаць сведчаннем былога жыцця нашых продкаў — радзімічаў. У наваколлі суседняй з Дзям'янкамі вёскі Вылева ёсць урочышча **Гарадзец**. Назва гэта не выпадковая, бо сведчыць аб старажытным гарадзішчы рубяжа старой і новай эры.

Месцы былых гарадзішча і паселішча не так ужо і проста ўбачыць. Яны зараслі травой. І толькі невялікія курганы, вышынёй ад паўметра да двух метраў, служаць арыенцірамі для ўважлівага вока. 40 такіх насыпаў маўкліва стаяць на рачным беразе за тры кіламетры ад Вылева ва ўрочышчы **Часнакова балота**. Асаблівa вялікая курганная група — 159 курганоў знаходзіцца на высокім правым беразе старыцы ракі Іпуць ва ўрочышчы **Беразані**, за пяць кіламетраў на паўднёвы ўсход ад Дзям'янак. Відаць, іх і мелі на ўвазе аўтары «России», калі гаварылі пра «множества курганоў» над Іпуццю.

Аб гэтых курганах існуюць легенды. Месцы іх размяшчэння людзі называюць «Бугры». Ідуць жыхары па ягады, па грыбы ці на рыбалку ў тыя месцы і гавораць: «Пайшлі ў Бугры». Некалі іх лічылі месцамі пахавання французскіх і шведскіх воінаў. Відаць, памяць аб войнах са шведамі і з Напалеонам, падзеі якіх адбываліся недалёка ад гэтых мясцін, захавалася ў свядомасці людзей і перадаецца з пакалення ў пакаленне. Дайшло і да нашага часу, нібы ў рэчышчы патоплена карэта самога Напалеона або шведскага караля Карла XII, які з войскам рухаўся праз усходнюю частку Беларусі ў пачатку XVIII стагоддзя.



На Бярэзіне. Фотаэцюд В. АЛЯШКЕВІЧА.

Можа таму яшчэ ў 1900 годзе мясцовы памешчык раскопваў дзям'янкаўскія курганы, але знайшоў замест скарбаў звычайныя пахаванні і трупаспаленні.

**Аляксандр РОГАЛЕЎ, кандыдат філалагічных навук.**

**[Працяг будзе].**

# *НІ ДНЯ БЕЗ ПЕСНІ*

Калі хто-небудзь скажа, што не любіць музыку, яму проста не паверацъ. Можна не разумець і не прымаць які-небудзь жанр, накірунак у ёй, але музыку ўвогуле не любіць немагчыма. Мне здаецца, што кожны можа знайсці ў ёй што-небудзь сваё: хто — у сучасных жанрах, хто — у класіцы ці ў фальклоры, а некаторыя захапляюцца і тым, і другім, і трэцім. Я ведаю нямала такіх людзей. Напрыклад, нядаўна пазнаёмілася з удзельнікамі хору «Сонейка» (Палац культуры Белсаўпрофа), у рэпертуары якога ёсць і народныя песні, і сучасная музыка.

Хор называецца дзіцячым, таму я спадзявалася ўбачыць малых і здзівілася, сустрэўшы падлеткаў 15—16 гадоў. Пазнаёмілася з некаторымі дзяўчынкамі і папрасіла іх расказаць пра сваё жыццё і захапленні.

8 гадоў у хоры займаецца Оля Козел. Яна ўжо закончыла 10-ы клас і выбрала прафесію, звязаную з музыкай. Яе сяброўкі — Каця Атрашэнка, Наташа Корба, Оля Панкевіч і Іра Дрозд прыйшлі ў калектыў пяць гадоў назад. Дзяўчынкі яшчэ не хутка скончаць школу, але ўжо сёння ведаюць, што калі музыка нават не стане іх прафесіяй, з ёю яны не расстануцца.

Усе яны любяць сучасную музыку, акрамя цяжкага металічнага рока, які лічаць негарманічным і немеладычным. Чытаюць у асноўным фантастыку. Напэўна, ім падабаецца тая рамантыка, якой багатыя творы гэтага жанру.

На зімніх канікулах хор прымаў гасцей з Ленінграда, якія прыехалі не толькі паглядзець Мінск, але і выступіць з канцэртамі. Харыстам з «Сонейка» таксама можна пазайздросціць: кожны год цікавыя паездкі — у Тарту, Львоў, іншыя гарады, у летнія і зімнія піянерскія лагеры.

Калектыў хору вельмі дружны. Яго ўдзельнікі праводзяць шмат часу разам: ходзяць у оперны тэатр і філармонію, у кіно і на выстаўкі.

— «Сонейка» — хор яшчэ даволі малады: нам усяго дзесяць гадоў, — расказвае кіраўнік Н. Жураўленка. — У 1977-м мы далі аб'яву ў газету. Тады прыйшло сто чалавек. Цяпер нас у чатыры разы больш, ёсць філіялы ў дзвюх школах. Дарэчы, да нас вялікі конкурс. Прыходзяць у асноўным дзеці, якія пяюць добра, таму бывае нялёгка выбраць самых дастойных.

Кіраваць калектывам з чатырохсот чалавек даволі цяжка, таму мы ўвялі самакіраванне: ёсць савет хору, старасты груп. Праблем з дысцыплінай не ўзнікае.

Нам ёсць чым пахваліцца: за 10 гадоў атрымалі нямала званняў, самае ганаровае з якіх — «узорны». Але самае важнае: мы выхоўваем людзей, якія ведаюць і любяць музыку.

Напэўна, хто-небудзь з харыстаў марыць стаць вялікім акцёрам. У гэтым няма нічога заганнага. Кім бы яны ні сталі ў будучыні, музыка ўзбагаціць іх жыццё, узвысіць душу і імкненні.

Вольга ТАМАШЭЎСКАЯ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

НАШ АДРАС:

МІНСК-ГСП, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.

ТЭЛЕФОНЫ: 33-01-97, 33-02-80, 33-03-15, 33-16-56, 33-07-82.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Індэкс 63854. Зак. 979.